Н. НЕДАСЕК

1917 - 1947

«БАЦЬКАЎШЧЫНА»

reference file available at www.xrite.com

reference file available at www.xrite.com

Н. НЕДАСЕК

1917 - 1947

Да трыццатых угодкаў найвызначнейшых падзеяў нашага нацыянальнага руху

«БАЦЬКАЎШЧЫНА»

reference file available at www.xrite.c

Адбітак з газэты
«БАЦЬКАЎШЧЫНА»

„The Fatherland“
Authorized by Headquarters European Command Civil Affairs Division A P O 757, A. G. 383, 7 GEC-AGO.
Aministration - (13b) Osterhofen, Ndby., Whiteruthenian D. P. Camp.
Printed by: Hils & Maier, Dingolfing, Bruckstraße 99.
Whiteruthenian Newspaper

reference file available at www.xrite.com

Прамінулы 1947 год, як і пачаты 1948 — юбілейныя ў нашым нацыянальным руху. У гэтых бо гадох спаўняюцца трыццатыя ўгодкі найвызначнейшых мамэнтаў ягонага найвышэйшага ўздыму, мамэнтаў, адзначаных такімі перлпараднае вагі вадзеямі, як Усебеларускі Кангрэс 18—31 сьнежня 1917 г., што вуснамі народных прадстаўнікоў упяршыню сфармуляваў прынцып нацыянальнае гаспадарстваўшчыны Беларусі, і акт 25 сакавіка 1918 г., што навек праклямаваў ейную гаспадарстваўскую незалежнасьць — гэты завяршальны ідэал кажнага нацыянальнага руху. Добра ўсьведамляць сабе асноўны прабег і сэнс, значаньне гэтых мамэнтаў і падзеяў ды належна адзначыць і ўшанаваць іх — само сабою зразумелы абавязак кажнага суродзіча. Хоць крыху, але як мага памагчы ў гэтым, увёўшы чытача ў курс справы — заданьне прапанаванага тут абеглага й сьціплага агляду, разгляданага як першая частка перад другой — «1918 — 1948», апрацаваць і апублікаваць якую будуць дакладзеныя ўсе стараньні ў наступным.

Наш нацыянальны рух, ягонае зараджэньне й разьвіцьцё

Нацыянальны рух — гэта змаганьне нацыі за ейнае самасьцьверджаньне. Зразумела, што ў нармальных абставінах усё жыцьцё нацыі становіць сабою такое бязупыннае самасьцьверджаньне яе ўва ўсіх кірунках і разрэзах — вонкавым і нутраным, гаспадарстваўска-палітычным і сацыяльна-эканамічным, культурным,

моўным і г. д. Толькі калі нармальнае жыццё нацыі пачынае дазнаваць нейкага адмаўленьня — нападу, абмежаньня, ушчамленьня, наагул напору дэнацыяналізацыі, ці хоць-бы пагрозы яе — можа выступіць наўзьверх гэтае прыроднае й законнае імкненьне да змаганьня за нацыянальнае самасьцьверджаньне, выліваючыся ў форме нацыянальнага руху. Дык, азначаючы паўней і дакладней, нацыянальны рух — гэта рух нацыі за сваё самасьцьверджаньне ў вабставінах супраціўна скіраванага ціску да адмаўленьня яе, да поўнае ейнае дэнацыяналізацыі.

Як ведама, наш народ ў самым развоі свае гісторыі стаўся ахвяраю вялікіх дэнацыяналізацыйных навалаў з боку сваіх суседзяў, перш заходніх, а тады і ўсходніх. Скіраваныя спачатку на перадавыя культурна-нацыянальныя пазыцыі, а далей даведзеныя й да глыбінных ды вызначальных гаспадарстваўска-палітычных цьвярдыняў, навалы гэтыя прывялі да ліквідацыі як самастойнае нацыянальнае культуры на ейных вярхох, пры адначаснай дэнацыяналізацыі носьбітаў гэтае культуры — верхніх пластоў народу, так і да зьнішчэньня незалежнае нацыянальнае гаспадарстваўшчыны. І тады, калі гэты працэс даходзіў ужо да самага свайго дна, заціснуўшы нацыянальную субстанцыю углыбкі ніжэйшых, бадай вылучна сялянскіх народных пластоў — у другой палавіне XIX в. пачынаецца нарэшце адваротна скіраваны яму шырокі працэс сталага нацыянальнага руху.

Ад самапершага этапу разьвіцьця гэтага апошняга працэсу даецца ўстанавіць у ім дзейнасьць сваеасаблівага, казаў той, рухавага мэханізму, які кажны раз разьвязвае й далей разьвівае ход гэнага руху. Дзейнасьць гэтага мэханізму, бяручы аналёгіі з тае-ж галіны, выглядае, казаў той, «чатырохтактаваю», зводзячыся да наступных вызначальных мамэнтаў —

reference file available at www.xrite.com

паступова парушальных «тактаў»: 1. вонкавая — ваенная — няўдача палітыкі чужога панявольніцкага ўраду, 2. выкліканая ёю рэвалюцыйная сытуацыя ўнутры кантраляванага гэтым урадам гаспадарства й выкарыстанне яе насьпелымі да рэвалюцыі часткамі яго-нага жыхарства, 3. тое ці іншае ўлучэнне нашага народу ў паўсталы такім парадкам рэвалюцыйны рух на сацыяльнай аснове і 4. эвалюцыйнае завяршэнне руху ў нацыянальна-ідэялёгічным кірунку.

Першы этап нацыянальнага руху — нацыянал-кансэрватызм

Першы этап нашага нацыянальнага руху меў за свой уступны «такт» няўдалую для Расеі Крымскую вайну 1854-56 г.г. Выкліканую гэтым рэвалюцыйную сытуацыю ў Расеі найперш і найбольш выкарысталі Палякі ў ведамым паўстаньні 1863 г. Праз улучэньне ў яго нашых нацыянальных элемэнтаў на чале з Кастусём Каліноўскім ды перанос паўстаньня й на нашую тэрыторыю — фактычна й запачаткаваўся наш нацыянальны рух, спачатку заакцэнтаваны найбольш на сацыяльным зьмесьце змаганьня за «мужыцкую праўду». Гэтую-ж лінію працягвае далей, хоць і ад крыху іншых адыходных пазыцыяў пачаўшыся, рух «беларускіх народавольцаў» зь ягонай яскравай постацяй Ігната Грынявецкага й першымі выяўнікамі ўжо нацыянальна-гаспадарстваўскае думкі — студэнцкім гуртком, зьвязаным ізь нелегальным часапісам «Гоман». Нарэшце, паўстанец 1863 г. Францішь Багушэвіч, стаючыся агульна прызнаным ідэялёгічным «бацькам» нацыянальнага руху, завяршае першы ягоны этап, даючы асновы нацыянальнае ідэялёгіі, што адначасна становяць сабою адыходны праграмны мамэнт і для наступнага.

ITB.7/2-1993
MONR2021:06-02
Version 2.2
reference file availab

Цэнтральная ідэя гэтага першага этапу нашага нацыянальнага руху — ідэя нацыянальнага захаваньня, абароны ад канчальнае дэнацыяналізацыі, найяскравей выражаная ў Багушэвіцкім лёзунгу «каб ня ўмерлі!» —ідэя, калі так сказаць, **нацыянал-кансэрватызму.** Аднак, паводля свайго размаху й абсягу гэты нацыянал-кансэрватыскі этап — яшчэ толькі **эпоха адзінак,** пачынальнікаў — «застрэльшчыкаў», пры агульнай інэртнасьці шырэйшых народных масаў, толькі зрэдку, спарадычна й эпізадычна зрываных да большых узрухаў (рух Кастуся Каліноўскага). Паводля формаў ідэялёгічнае зброі — гэта **эпоха праклямацыяў,** найчасьцей вершаваных (Багушэвіч, навет Кастусь Каліноўскі).

Другі — нацыянал-гуманістычны этап нацыянальнага руху

Уступным тактам да другога этапу нашага нацыянальнага руху сталася няўдача Расеі ў вайне зь Японіяй 1904-5 г.г. Паўсталая ў выніку гэтага рэвалюцыйная сытуацыя вылілася, як ведама, у г. зв. «Першую Расейскую рэвалюцыю» 1905 г., у якую адразу-ж улучылася першая нашая нацыянальная рэвалюцыйная партыя — «Беларуская Сацыялістычная Грамада», створаная яшчэ ў 1902 г. як «Беларуская Рэвалюцыйная Партыя», у 1903 г. ператвораная спачатку ў «Беларускую Рэвалюцыйную Грамаду», а тады канчальна ў «Беларускую Сацыялістычную Грамаду». Сацыяльны радыкалізм сацыялістычнага кірунку гэтае партыі, на аснове якога й адбывалася ейнае ўлучэньне ў вагульны рух «першае Расейскае рэвалюцыі», найбольш выявіўся ў кароткатрывалай першай легальнай нашай газэце «Наша Доля» (1906), каб пасьля эвалюцыянаваць у нацыянальным сэньсе ў ейнай наступніцы «Нашай Ніве» — прызнанай ідэялёгічнай права-

reference file available at www.xrite.com

дырцы цэлай эпохі, папулярна ад яе й называнай «нашаніўскай парою», Цэнтральная ідэя гэтае пары — ідэя нацыянальнага адраджэньня, — калі так сказаць — **нацыянал-гуманізму,** найяскравей выражаная ў ведамым Купалаўскім лёзунгу «людзьмі звацца!». Нацыянал-гуманістычная «нашаніўская» пара — гэта ўжо **эпоха гурткоў,** а не адзінак, а паводля формаў ідэялёгічнае зброі — **эпоха нацыянальнае прэсы,** хоць і ня шырака разгалінаванае, але ўжо сталае («Наша Ніва» 1906—1915).

Наступны, трэйці этап нашага нацыянальнага руху адчыняе першая сусьветная вайна, у якой няўдачы Расеі, пачынаючы ад 1915 г., спрычынілі глыбокую й шырокую рэвалюцыйную сытуацыю, што й разьвязалася ў рэвалюцыі 1917 г., разгортаньне якое ў нас і прывяло да тых вызначальных, а сяньня юбілейных падзеяў, якія й становяць сабою сьціслую тэму гэтага агляду.

Уздым нацыянальнага руху на ягоным трэйцім — нацыянал-дэмакратычным этапе

Ужо тыя няўдачы Расеі ў вайне зь Немцамі, што прывялі да акупацыі імі заходняе часткі нашага краю ў 1915 г., далі вялікі штуршок да ажыўленьня там нацыянальнага руху. Гэтае ажыўленьне выявілася ня толькі ў ваднаўленьні перапыненае вайною працы ў тых самых формах і кірунках (газэта «Гоман» — просты працяг «Нашае Нівы»), але і ў заснаваньні першых нацыянальных арганізацыяў легальнага тыпу («Беларускі Нацыянальны Камітэт») і навет гаспадарстваўскага характару («Канфэдэрацыя Вялікага Княства Літоўскага»), а ў нелегальнай форме — і характару незалежніцкага («Сувязь незалежнасьці й непадзельнасьці Беларусі» — першая незалежніцкая ар-

ганізацыя на чале з В. Ластоўскім), ды нарэшце — у першых крокаў на міжнароднай арэне (удзел у звароце «Лігі чужых народаў Расеі» да прэзыдэнта ЗША Вільсона 5. 5. 1915, у канфэрэнцыях гэтае Лігі ў Шток-гольме, Лёзане й г. д.).

Але толькі рэвалюцыя 1917 г. адчыняе шырэйшыя магчымасьці да разьвязаньня масавага нацыянальнага руху, пераносячы ягоны цэнтр цяжару ў усходнюю частку краю, найперш і найбольш — у Менск. Тут і пачынаецца, сьціслa кажучы, новы этап гэтага руху, паводля свае цэнтральнае ідэі этап **нацыянал-дэмакратычны**, скіраваны да разбудовы нацыі на шырокіх дэмакратычных асновах. Паводля свайго абсягу й арганізацыйных формаў гэта ўжо — **эпоха зьездаў** і створаных імі **нацыянальных органаў**, а ня толькі гурткоў ці адзінак, як гэта мела месца на папярэдніх этапах. Таксама й нацыянальная прэса, хоць і аднаўляе й тут папярэднюю сваю ролю ідэялёгічнага правадыра («Вольная Беларусь» — усходні, менскі працяг «Нашае Нівы»), але ўжо падмацоўваецца ў гэтым і новымі дзейнікамі — з аднаго боку, нацыянальнымі палітычнымі партыямі (адразу выйшлая наўзьверх із падзямельля «Беларуская Сацыялістычная Грамада», новапаўсталая «Беларуская Партыя Народных Сацыялістых» у Менску, «Беларуская Народная Грамада» ў Маскве, «Хрысьціянская Дэмакратычная Злучнасьць» у Пецярбургу), а з другога — першымі нацыянальнымі вайсковымі арганізацыямі, ад гурткоў да камітэтаў, што ўпяршыню пачынаюць ставіць да паслугаў руху, у дадатак да выпрабаванае ідэялёгічнае зброі, ужо й запраўдную зброю, зброю фактычную.

Улучэньне ў рух, як і на папярэдніх этапах, адбываецца й тут адразу на сацыяльнай аснове, найперш і найшырэй разгорнутай усёй рэвалюцыяй. Асноўны

reference file available at www.xrite.com

тон цэламу руху, асабліва на самых ягоных пачатках, задаець адразу, як ужо ўспаміналася, выйшаўшы з падзямельля, «Беларуская Сацыялістычная Грамада». Навет чыста нацыяналістычныя і ў сацыяльнай ідэялёгіі вельмі правыя арганізацыі змушаныя пачынаць працу пад сацыялістычнай шыльдай («Беларуская Партыя Народных Сацыялістых»). Аднак, нацыянальны мамэнт ня толькі не затушоўваецца ад першых-жа пачаткаў, але вельмі борзда пераймае на сябе кіраўнічую дамінантную ролю. Так, ужо ў першым дакумэньце дадзенага этапу — пецярбурскай Дэкляpацыі 15. 3. 1917 г. — побач з агульнымі сацыяльнымі дамаганьнямі, фармулююцца й патрабаваньні чыста нацыянальныя. Скліканы на 25 сакавіка 1917 г. у Менску зьезд «Беларускае Сацыялістычнае Грамады» адразу-ж спалучаецца зь першым агульнанацыянальным зьездам арганізацыяў і дзеячоў, што ў выніку свае працы (25-27 3. 1917 г.) стварае і агульнанацыянальны орган — **«Беларускі Нацыянальны Камітэт».**

Першы нацыянальны зьезд 25 - 27 сакавіка 1917 г. і адчыняе сабою тую эпоху — чараду зьездаў, што афармоўвае ўвесь нацыянал-дэмакратычны этап нашага нацыянальнага руху. Наступныя зьезды, штораз пашыраючы асновы й абсяг руху, мадыфікуюць на гэтых пашыраных асновах форму, абыймо й склад вышэйшых нацыянальных органаў-прадстаўніцтваў. Так, ліпенскі зьезд нацыянальных арганізацыяў і партыяў ператварае Беларускі Нацыянальны Камітэт у **«Цэнтральную Раду Беларускіх Арганізацыяў і Партыяў».** Нацыянальныя жаўнерскія зьезды у верасьні й кастрычніку 1917 г. прыводзяць да стварэньня ў сярэдзіне кастрычніка **«Цэнтральнае Беларускае Вайсковае Рады»,** што пад канец гэтага месяца задзіночваецца із Цэнтральнай Радай Беларускіх Ар-

reference file available at www.xrite.com

ганізацыяў і Партыяў у **«Вялікую Беларускую Раду»**, якая адразу-ж ставіць пытаньне аб скліканьні ў Менску Усебеларускага Зьезду-Кангрэсу, выдаючы аб гэтым у сярэдзіне лістапада адозву «да ўсяго беларускага народу», дзе падаецца й тэрмін зьезду на 18 (5) сьнежня 1917 г.

На шляху да Ўсебеларускага Кангрэсу

Аднак, побач з актывізацыяй нашага нацыянальнага руху, адбываецца падобнае ажыўленьне на нашых землях рухаў рэгіянальнага і рэгіяналістычнага характару, з чужых і варожых бакоў інсьпіраваных і ў гэныя-ж бакі зарыентаваных. Гэткія рухі суправаджалі наш рух ад самых пачаткаў ягонага зараджэньня і, будучы фактычна экспазытурамі й апорай дэнацыяналізатарства, імкнуліся як мага змагаць гэны рух і зь ягонага боку выклікалі патрэбу адпорнага змаганьня. Асабліва моцным і актыўным быў пры гэтым прарасейскі рэгіяналізм, маючы за сабой заўсёды падтрыманьне й інсьпірацыю з расейскага ўрадавага боку. На першым нацыянал-кансэрватысцкім этапе нашага руху ён выяўляўся ў плыні г. зв. «западнарусізму», што дала такія фігуры, як Каяловіч, Гавароўскі, Жуковіч, Харлампавіч, а ў літаратуры — славуты Пшчолка. На другім нацыянал - гуманістычным, «нашаніўскім» этапе ён згуртаваўся вакол спэцыяльна у працівагу «Нашай Ніве» выдаваных і супраць яе скіраваных часапісаў «Крестьянин» (1906-1912) і «Белорусская Жизнь» (1912—1915) ды нарэшце афармаваўся і ў собскай арганізацыі «Белорусское Общество» (ад 1912 г.) пад правадырствам ведамых «тоже-белоруссов» Кавалюка, Саланевіча й іншых.

Адразу-ж пасьля рэвалюцыі «тоже-белоруссы» пачалі арганізоўвацца, цяпер ужо на моднай «дэмакратычнай» пляцформе. 23 сакавіка 1917 г. у Гомелі за-

reference file available at www.xrite.com

сноўваецца іхны «Саюз Беларускага Народу», над якімі, як іхнае вывяршэньне, паўстае ў Пецярбургу «Беларускі Краінны Камітэт пры Ўсерасейскім Савеце Сялянскіх Дэпутатаў» («Белорусский Областной Комитет при Всероссийском Совете Крестьянских Депутатов»). Апошняя арганізацыя ўжо ў самым сваім назове зьмяшчае сваё асноўнае ўстановішча рэгіяналізму, і ад яе ўсе прыхільнікі разгляданьня нашага краю толькі як расейскае правінцыі — «области», без асноваў і правоў да самастойнага нацыянальна-культурнага й гаспадарстваўска - палітычнага будаўніцтва, дастаюць на дадзеным этапе мянушку «абласьнікоў».

Даведаўшыся аб скліканьні Вялікай Беларускай Радай Усебеларускага Кангрэсу ў Менску, «абласьнікі» ў спэцыяльнай «Дэклярацыі» свайго «Белорусского Областного Комитета» ад 30 (17) лістапада 1917 г. запаведуюць такі самы Ўсебеларускі Зьезд у тым-жа Менску, але на 10 дзён пазьней — на 28 (15) сьнежня. Каб не дапусьціць да дэзарыентацыі й абаламучаньня шырэйшых масаў «абласьнікамі», Вялікая Беларуская Рада ідзець на перамовы зь імі, у выніку чаго дасягаецца нарэшце кампраміс у скліканьні супольнага зьезду — Першага Ўсебеларускага Кангрэсу ў Менску, што й становіць сабою найвызначнейшы мамэнт ня толькі разгляданага тут этапу, але і ўсяго нашага нацыянальнага руху.

Усебеларускі Кангрэс — агульнанацыянальная рэпрэзэнтацыя

Першы Ўсебеларускі Кангрэс і адчыніўся ўрачыста 18 (5) сьнежня 1917 г. у будынку Менскага Гарадзкога Тэатру. Зьехалася на яго 1.872 дэлегаты, зь якіх 1.167 мела пастаноўны, а 705 дарадны голас. Сярод дэлегатаў з пастаноўным голасам 800, г. зн. 55% належала сялянскай і работніцкай масе, 22% — працоўнай ін-

reference file available a
NR2021:06-02
ion 2.2
7/2-1993

тэлігенцыі таго самага сялянскага ці работніцкага паходжаньня. Такім парадкам, 87% дэлегатаў рэпрэзэнтавала беларускі працоўны народ, і толькі 13% прыпадала на долю іншых сацыяльных групаў. Гэткі склад дэлегатаў бадай зусім дакладна адлюстроўваў сацыяльную структуру ўсяго нашага народу на тым этапе, і з гэтага гледзішча агульнанацыянальная, запраўдная «ўсебеларуская» рэпрэзэнтацыйнасьць Кангрэсу не падлягае ніякай няпэўнасьці.

І з тэрытар'яльнага гледзішча Кангрэс меў такую-ж поўную рэпрэзэнтацыйнасьць, прадстаўляючы свайміі дэлегатамі увесь абсяг нашае нацыянальна-этнаграфічнае тэрыторыі — ня толькі ейнае ўсходняе часткі (Меншчыны, Віцебшчыны, Магілеўшчыны, Смаленшчыны), але й заходняе, у тым часе акупаванае Немцамі (Віленшчыны й Горадзеншчыны), аднак рэпрэзэнтаванае на зьезьдзе дэлегатамі ад уцекачоў, што станавілі тады вялізарную масу жыхарства гэных мясцовасьцяў.

Асобна трэба адзначыць, што сярод удзельнікаў зьезду было 716 вайсковых дэлегатаў. Дык была, такім парадкам, і вельмі паважная рэпрэзэнтацыя змабілізаваных і ў вайсковасьць уцягнутых пластоў народу, колькасна вельмі ўзрослых за папярэднія гады першае сусьветнае вайны.

Наагул, што да рэпрэзэнтацыйнасьці Кангрэсу, дык можна толькі падзяліць аўтарытэтныя словы аднаго зь ягоных удзельнікаў, пазьнейшага Прэзыдэнта Беларускае Народнае Рэспублікі Пётры Крачэўскага: «Шматлюднасьць Зьезду гавора сама за сябе, бо ніводная нацыя за пэрыяд вялікае расейскае рэвалюцыі не дала такое колькасьці ўдзельнікаў і, натуральна, воля народу на ім была выяўленая зусім заканамерна, гэтага ня будзе й ня мае права аспрэчваць ніхто». Таксама і ў дачыненьні да нацыянальнага характару

reference file available at www.xrite.com

гэтае рэпрэзэнтацыйнасьці: «Тымчасам, як на ўсіх зьездах разбушаванае расейскае рэвалюцыі дамінавалі ўплывы прадстаўнікоў не маскоўскае нацыі, як бальшыні, а нацыяў сама нязначнае колькасьці, як Жыды, Латышы й інш. — на Ўсебеларускім Зьезьдзе прадстаўніком быў запраўдны Беларускі Народ — сяляне, жаўнеры й верная народу група інтэлігенцыі без усякае пабочнае дамешкі іншых нацыяў. Тутака ня было ні Жыдоў, ні Палякоў, ні Латышоў, і толькі кантрабандным спосабам трапіла колькі «таварышоў» з Маскоўцаў, што прыехалі з выразнай мэтай справакаваць зьезд, што-б там ня было». (П. Крачэўскі Хто быў на першым Ўсебеларускім Зьездзе? Часапіс «Варта», № 1 за 1918 г., бал. 34).

Змаганьне на Кангрэсе

Бальшыня Кангрэсу падтрымвала Вялікую Беларускую Раду й ейны нацыянальны кірунак, «абласьнікі» із сваім прарасейскім рэгіяналізмам апыніліся ў выразнай мяншыні. Паводля тэрытарыяльных дэлегацыяў прыхільнікі абодвых кірункаў разьмеркаваліся так, што дэлегацыі Віленшчыны, Горадзеншчыны, Меншчыны і, што асабліва характэрна, Смаленшчыны былі апораю нацыяналістых зь «Вялікае Рады», тымчасам як рэгіяналістыя — «абласьнікі» мелі некаторы грунт толькі ў дэлегацыях Віцебскага й Магілеўскага «земстваў». Гэтае дачыненьне сілаў адлюстравалася і ў выбарах кіраўнічых асобаў Кангрэсу: за старшыню яго стаўся нацыяналісты з «Рады» др. І. Серада, толькі на заступніка быў абраны адзін із правадыроў «абласьнікоў» Вазіла. У сакратарыяце нацыяналістыя мелі таксама такія выдатныя асабістасьці, як Алесь Прушынскі (паэта Алесь Гарун) і Тамаш Грыб, гвалтоўная бальшыня іхная была і ў вабранай Кангрэсам у складзе 71 сябра ягонай Радзе

— «Радзе Старэйшых».

«Абласьнікі» адразу ўзялі курс на зрыў Кангрэсу праз правакацыю, абструкцыю й простую дывэрсію — курс, пачаты імі, зрэшты, яшчэ ў іхнай «Дэклярацыі» ад 30 (17) лістапада зь ейнай стаўкай на перахапленьне ініцыятывы ў свае рукі праз адтэрмінаваньне зьезду. Для абструкцыі й правакаваньня інцыдэнтаў выкарыстоўваліся бясконцыя прывітаньні, што не давалі зьезду заняцца рэчавай працай. Гэтак, адным із такіх «прывітаньняў» быў справакаваны інцыдэнт з абразай нацыянальнага сьцягу, які быў публічна названы «анучай», што выклікала бурна падтрыманую бальшынёй адказную дэманстрацыю дэлегата — старога генэрала, які тут-жа пацалаваў абражаны сьцяг. Другі інцыдэнт у часе адпору аднаму зь Віцебскіх «тоже-белоруссов», што спрабаваў публічна бэсьціць усю нацыянальную справу, «абласьнікі» спрабавалі разыйграць, як «абразу зьезду», але таксама няўдала. Прывітаньне аднаго сьвятара, задэкляраванага прыхільніка й нават умандатаванага прадстаўніка «ўлады саветаў» (адзін із характэрных кур'ёзаў таго часу), які спрабаваў угрунтаваць непадзельнасьць «трыадзінага рускага народу» на «Вялікарусаў, Маларусаў і Беларусаў» параўнаньнем да неразлучнасьці асобаў Сьв. Тройцы — таксама выклікала даволі бурны інцыдэнт, хоць і больш камічнага характару. Нарэшце, «абласьнікі» спрабавалі й проста самачынна распусьціць зьезд, арганізаваўшы праз сваю ўзброеную прадстаўніцу з Магілеўшчыны «абмен» дэлегацкіх мандатаў на адпускныя карткі для разьезду дэлегатаў па дамох. Але й гэтая спроба была разьбітая.

Аднак, «абласьнікі» мелі за сабою вонкавае падтрыманьне ў васобе бальшавікоў, што пасьля свае кастрычніцкае рэвалюцыі 1917 г. ужо кантралявалі ўладу па ўсім прасторы былое расейскае імпэрыі, хоць

reference file available at www.xrite.com

яшчэ й далёка ня мелі свае пазьнейшае моцы. Фактычна, «абласьнікі» й ліпелі пры бальшавіцкім «савеце». Праўда, бальшавікі таксама паслалі былі на Кангрэс і сваю собскую дэлегацыю зь 10 асобаў зь Пецярбургу, але яна чулася гэтак слаба, што ня важылася навет выткнуцца дзеля выкананьня дадзенага ёй у «цэнтры» заданьня — нахіленьня Кангрэсу да праклямаваньня савецкае гаспадарстваўскае сыстэмы на Беларусі. Калі-ж прыняцьцём свае першае рэзалюцыі аб рэспубліканска-дэмакратычнай сыстэме Кангрэс наагул унемагчыміў выкананьне гэтага заданьня — вонкавая інтэрвэнцыя бальшавікоў, як ведама, сілаю ўзброенага гвалту зусім спыніла дзейнасьць Кангрэсу.

Перарост Кангрэсу ў Гаспадарстваўскую Канстытуанту

Пасьля папярэдніх гарачых і зацяжных дыскусіяў над рознымі агульнымі й абсяжнымі праблемамі, характэрных наагул для ўсіх бадай сходаў і зьездаў таго рэвалюцыйнага часу, а тут яшчэ больш зацягваных успомненымі вышэй спробамі правакацыі, абструкцыі й дывэрсіі, — Кангрэс нарэшце 30 (17) сьнежня 1917 г. перайшоў да сфармуляваньня першых сваіх пастановаў. Найпершым, зусім прыродна, стаяла кардынальнае пытаньне аб гаспадарстваўскім ладзе нашага краю.

Нацыяналістыя зусім зразумела стаялі на прынцыпе сэпарацыі ад Расеі й незалежнае нацыянальнае гаспадарстваўшчыны. Але «абласьнікі» цьвёрда трымаліся свайго «адзінанедзялімскага» рэгіяналізму й ніяк не хацелі йсьці далей за вельмі куртатую «абласную» аўтаномію ў складзе адзінае й непадзельнае паранейшаму Расеі. Хоць дзякуючы сваім штучкам, выяўна скіраваным на зрыў Кангрэсу наагул, «абласьнікі» ўсё больш і больш траці̀лі ўваччу шырокіх масаў, ад-

reference file available
8.7/2-1993
ONR2021:06-02
rsion 2.2

нак, з другога боку, гэтыя масы яшчэ далёка не дарасьлі й не дасьпелі да нацыянальна-незалежніцкага становішча. Таму давялося шукаць кампрамісу, прыймальнага і для нацыяналістых, і для няўсьведамленых яшчэ шырэйшых масаў. Такі кампраміс між сэпаратызмам і рэгіяналізмам і быў знойдзены ў выглядзе прынцыпу фэдэралізму — вымаганьня перабудовы Расеі на фэдэрацыю нацыянальных адзінак — рэспублікаў. Гэткі фэдэралізм, хоць і не дацягаў да незалежніцтва й мог разглядацца хіба толькі як пераходная ступень да яго, разам із тым меў за сабою ўжо тое надзвычай вартаснае, што таіў у сабе глыбейшы прынцып нацыянальнае гаспадарстваўшчыны — прынцып, якім рэгіяналізм няўзнак для самога сябе ўражаўся, як кажуць, у самае сэрца, а нацыяналізм даставаў патрэбную базу для далейшае дзейнасьці.

Дык першы пункт рэзалюцыі Кангрэсу, які на аснове праклямаванага рэвалюцыяй права на нацыянальнае самавызначэньне, абвяшчаў рэспубліканска-дэмакратычную ўладу ў краі ў форме Беларускае Народнае Рэспублікі, сфэдэраванай з такімі-ж рэспублікамі іншых суседніх нацыяў у Расейскай Дэмакратычнай Фэдэрацыйнай Рэспубліцы — зачытаны сакратаром Т. Грыбам, быў прыняты ўсім Кангрэсам. Гэтым самым Кангрэс ужо пераростаў у гаспадарстваўскую канстытуанту — установы сойм нашага краю. Але гэта й быў якраз той апошні ўдар па бальшавіцкіх плянах, які змусіў бальшавікоў дзеяць безадкладна й гвалтоўна, яшчэ перад тым, як разгорнецца назначаны наступны пункт, лёгічны працяг першага — выбары рэпрэзэнтацыйных і выканальных органаў новае Рэспублікі.

Неўмандатаваны й няпрошаны «дэлегат» — мясцовы менскі бальшавік Крывашэін выкарыстаў выпрабаваны ўжо на зьезьдзе прыхватак «прывітаньня»,

reference file available at www.xrite.com

каб пасьля абструкцыйнага зацягваньня яго, закончыць грубай заявай аб «роспуску сходу», тут-жа падмацаванай вайсковай сілай салдацкіх штыхоў, кулямётаў і панцырнікаў. Цэланочнае змаганьне бяззбройных дэлегатоў з бальшавіцкімі, да зубоў узброенымі й «дзеля адвагі» п'янымі «дэмакратамі» шляхам барыкадаваньня, сарамачэньня «рэвалюцыянэраў» іхнымі-ж рэвалюцыйнымі песьнямі супраць «дэспатаў» ды іншымі падобнымі даступнымі, але ўсё-ж ня вельмі эфэктыўнымі спосабамі — закончылася перамогаю фізычнае сілы й зброі — разгонам Кангрэсу пры арыштах найбольш актыўных дэлегатаў, фізычных зьнявагах ,параненьнях іх і г. д.

Аднак, Першая Гаспадарстваўская Дэмакратычная Канстытуанта на гэтым не абарвала свае працы, не закругліўшы яе. Назаўтрае, 31 (18) сьнежня 1917 г. Кангрэс зыйшоўся ў менскім чыгуначным дэпо, дзе пад аховай чыгуначнікаў перадаў свае паўнамоцтвы аж да часу магчымых вольных выбараў абранай раней сваёй Радзе, што тут-жа вылучыла свой Выканальны Камітэт, які й павёў далейшае змаганьне за ўжыцьцёўленьне праклямаванае Кангрэсам нацыянальнае гаспадарстваўшчыны. Спробы бальшавікоў разагнаць і гэты сход адразу-ж разьбіліся аб станоўкую абарону чыгуначнікаў, што карысталіся гэным часам вялікай аўтаномічй і сілай.

Праца Выканальнага Камітэту Рады Кангрэсу, спачатку нелегальная, а пасьля й афіцыйная, прывяла да таго ўзвышша нашага нацыянальнг руху, якое дало самы векапомны акт 25 сакавіка 1918 г., што ўжо, аднак, выходзе за межы гэтага нашага агляду.

Значаньне Кангрэсу

Цяпер ужо няцяжка падвесьці вынікі пад папярэднім і канчальна сфармуляваць усе мамэнты знача-

ITB.7/2-1993
MONR2021:06-02
Version 2.2
reference file available

ньня Першага Ўсебеларускага Кангрэсу — гэтага завяршальнага шчыту нашага нацыянальнага руху ў ягоным рэвалюцыйным 1917 годзе.

Значаньне Першага Ўсебеларускага Кангрэсу найперш у ягонай **рэпрэзэнтацыйнасьці,** беспрэцэдэнтавай як у нашай гісторыі — і папярэдняй (ад часоў страты незалежнасьці), і наступнай — так і навет у гісторыі іншых народаў былое расейскае імпэрыі, што таксама і ў тым самым часе выступілі на змаганьне за сваё гаспадарстваўскае жыцьцё. Поўная праўда належыцца цытаванаму вышэй П. Крачэўскаму, што **ніводная нацыя былое расейскае імпэрыі ня мела такога рэпрэзэнтацыйнага ўва ўсіх дачыненьнях, запраўды агульнанароднага сходу — выражальніка народнае волі да адбудовы свайго гаспадарства, як наш Першы Ўсебеларускі Кангрэс.**

Але ў гэтай рэпрэзэнтацыйнасьці Кангрэсу сяньня асабліва важна падчыркнуць ейны дэмакратычны характар. **Мандат кажнага дэлегата Кангрэсу паходзіў з вольных дэмакратычных выбараў,** а не з «кааптаваньня», «пакліканьня» ці падобных сурагатаў дэмакратыі, напару вымушаных абставінамі, а напару й з прынцыпу ўжываных. У гэтым палягае й вялізарная, можна сказаць, проста прадонная розьніца між Першым Кангрэсам і г. зв. «Другім Усебеларускім Кангрэсам», скліканым за апошняй нямецка-гітлераўскай акупацыяй у тым-жа Менску, 27 чырвеня 1944 г. Гэтая розьніца такая самая, як, прыкладам, розьніца між дэмакратычна абіраным клясычным ангельскім парлямэнтам ці кангрэсам ЗША з аднаго боку і пакліканым «фюрэрам» райхстагам «Трэйцяга Райху», сфармаваным «дучэ» італьлянскім фашыстаўскім парлямэнтам, ці навет «дэмакратычна» майстраванымі «вярхоўнымі саветамі» ў СССР — наагул, усімі фор-

reference file available at www.xrite.com

мамі «народнага прадстаўніцтва» ў таталітарных сыстэмах.

Цэнтральны пункт значаньня Першага Ўсебеларускага Кангрэсу — гэта, бясспрэчна, **абвешчаньне ім нашага краю асобным гаспадарствам у форме дэмакратычнае Беларускае Народнае Рэспублікі (БНР).** Хоць толькі на эміграцыі сяньня перахаваная, але дагэтуль не перарваная традыцыя БНР мусіць асабліва ганіцца намі дзеля гэтае свае асьвячанасьці запраўды рэпрэзэнтацыйным і дэмакратычным народным волявыяўленьнем у першай гаспадарстваўскай канстытуаньце нашага краю — Першым Усебеларускім Кангрэсе.

Адначасна гэтая абвешчаньне мае першараднае значаньне, як найбольшая апараза нядошлага й няволь-ніцкага рэгіяналізму, што й тады, як і раней ды пазьней, аж дагэтуль — не становіць сабою нічога іншага, як толькі чужацкую й варожую, дэнацыяналізатарскую экспазытуру, узброеную ўсё тымі-ж захаляўнымі нажамі правакацыі, абструкцыі й дывэрсіі ды падтрымванаю тымі-ж закуліснымі заплечнікамі — бальшавікамі.

Першы Ўсебеларускі Кангрэс — гэта вялікі пераломны мамэнт нашага нацыянальнага руху, што стварыў трывалую базу для ягонага далейшага наступу і ўздыму, упаасобку й першым чынам — **грунт і пачынак да вялікага акту 25 сакавіка.** Але не на апошнім месцы трэба падчыркунць і тое, што тут якраз, на Першым Усебеларускім Кангрэсе 1917 г. наш нацыянальны рух упяршыню ўвайшоў у **вадкрыты канфлікт із маскоўскім тэрарыстычным бальшавізмам,** адчыніўшы на сяньня ўжо трыццацігадовую сваю незамірэнную вайну зь ім. І тут на канчатак нам хочацца толькі паўтарыць ужо неаднойчы выказванае:

Разгонам Першага Ўсебеларускага Кангрэсу 1917 г. бальшавіцкі штых упяршыню, але навек красамоўна

ITB.7/2-1993
MONR2021:06-02
Version 2.2
reference file available

расьпісаўся ў гісторыі Беларусі. У гістарычным разрэзе гэты факт аказаўся вельмі сымптаматычным, нават, можна сказаць — сымбалічным. Ён адразу-ж і назаўсёды вызначыў усе далейшыя дачыненьні бальшавізму да Беларусаў. Ад разгону Ўсебеларускага Кангрэсу да ўсё новых і новых, шырэйшых і шырэйшых пэрманэнтных спробаў разагнаць ня толькі народных прадстаўнікоў, а і ўвесь наш народ, раскідаць яго па неабсяжных тундрах і сібірах вялікае катаргі народаў, а лепшых сыноў — «простым транспартам» пераканць да самых «тварцоў марксызму-ленінізму» на той сьвет, пад жудасным тэрорам зь невялікімі «прасьветамі» салодка пасыпанае й агіднацынічнае ў глыбіні правакацыі ў міжчасьсі — гэтак улажыўся цярністы й крывавы шлях гэных дачыненьняў. Адгэнуль і дасюль бальшавізм ня кідае ўжо думкі аб гэтых дзьвюх рэчах, якія, як відаць, цьвёрда й назаўсёды зьвязаліся ў ягоных п'яных і хворых мазгох: Беларусы й разгон...

Ды чым далей, тым больш і больш разгон гэты пачынае памшчацца на самых-жа разгоншчыках. Поўняцца ,перапаўняюцца народнымі рыцарамі помсты лясы й пушчы нашага краю, і рады няма, бо ўжо ня толькі лесавыя дабрахоты, а і ўвесь народ усё бліжэй падаецца да таго, каб нарэшце ізноў узяць і свой голас ува ўсёй гэтай справе, успамінаючы словы тае, сьпяванае ўпяршыню на Першым Усебеларускім Кангрэсе, а пасьля забароненае й выгнанае бальшавікамі нацыянальнае песьні:

Мы дружна паўстанем з касамі, зь сярпамі
Прагонім зь зямлі палачоў!

Прагнаць палачоў-катаў, правакатараў-разгоншчыкаў навек із нашае роднае зямлі! — гэтакае сяньняшняе народнае жаданьне. І, мы верым моцна — яно станецца!

---

reference file available at www.xrite.com

ЦАНА 2.— НМ.

reference file available at www.xrite.